# Дзіця свайго часу

### *Смелы ўчынак Валянціны Коўтун*

**Як вядома, 15 ліпеня спаўняецца 150 гадоў з дня нараджэння Цёткі. Сярод тых, хто звярнуўся да яе асобы, і Валянціна Коўтун, 80-годдзе з дня нараджэння якой таксама адзначаецца сёлета (нарадзілася 6 красавіка 1946 года). Жаданне далучыцца да жыцця Алаізы Пашкевіч (сапраўднае прозвішча Цётка), магчыма, выклікала вучоба ў Львоўскім дзяржаўным універсітэце імя Івана Франко, у горадзе, дзе Алаіза Сцяпанаўна некаторы час жыла.**

Валянціна Міхайлаўна і сама пісала вершы. Цікава, што спачатку, у 1966 годзе, яны былі змешчаны ў газеце «Леніньска молодь» у перакладзе на ўкраінскую мову. Па-беларуску дэбютавала ў ліпені таго ж года ў газеце «Чырвоная змена» вершам «Зязюля недакукавала…». У жніўні ж у «ЛіМе» ўжо з'явілася нізка твораў. Пераехаўшы ў Мінск, вучобу прадоўжыла ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Першы зборнік «Каляровыя вёслы» выйшаў у 1971 годзе. За ім былі «На ўзлёце дня» (1977), «На зломе маланкі» (1981)…

У дэбютнай кніжцы з агледзін сённяшняга дня, асэнсоўваючы набыткі Валянціны Коўтун не толькі ў галіне паэзіі, а і прозы, асаблівы сэнс набывае верш, у якім ёсць такія радкі: «Між слоў шукайце зерне, // Каб вырасціць дабро // Так трэба мне!» У ім закладзена свайго роду жыццёвая, творчая праграма лірычнай гераіні, а значыць, і самой пісьменніцы. «Расціць дабро» — вобраз шматаблічны. Ён з тых, што актуальны ў розныя часы. Гэта і даказвала творамі, шукаючы не толькі сваё месца ў жыцці, а і звяртаючыся да асоб, якія жылі раней. Характэрная ў гэтым сэнсе паэма «А Прыпяць не спыніць…», падзеі ў якой адбываюцца ў 1240 годзе, калі палешукі на Піншчыне баранілі радзіму ад ханскага нашэсця:

*Гудзела сеч —*
*і пaляглі*
*Палешукі!..*
*Быў мяккі бераг,*
*Іх пальцы моцныя ўраслі*
*У зямлю карэннямі аеру.*

Адназначна не скажаш, ці, выкарыстоўваючы такі эмацыянальна насычаны малюнак барацьбы з чужынцамі, уяўляла і іншых барацьбітоў. Не тых, якія заваёўвалі іншыя народы, а якія свайму народу не адмаўлялі ў праве на шчаслівае жыццё. У свой час крытык Тамара Чабан, рэцэнзуючы гэтую паэму, назвала яе «самым лірычным творам у зборніку».

Да вобразу Алаізы Пашкевіч пісьменніца звярнулася ў паэме «На зломе маланкі». Тут мала сюжэтнага дзеяння: «У цэнтры яе ўнутранае жыццё Цёткі, яе духоўная эвалюцыя. Таму і дамінуе тут мова маналагізаваная, адлюстраванне ўнутранага "я", лірычныя медытацыі. Паэма насычана разнастайнымі народна-песеннымі вобразамі, асацыятыўнасцю, метафарычнасцю». Усё гэта дазволіла Валянціне Міхайлаўне, як меркаваў Уладзімір Гніламедаў, дасягнуць таго, што і задумвала: «У асобе Цёткі арганічна зліліся лёс чалавечы і лёс народны».

Развіваючы гэтую думку, Валянціна Локун падкрэслівала: «Цётка ў паэме В. Коўтун — дзіця свайго часу. Нават у далёкай Венецыі яна не можа існаваць без родных краявідаў, яе душа прагне "поля скібіну з соллю расы, ластаўчыныя гнёзды ў адрыне, на пагорках вякоў верасы", а позірк знакамітай мадонны Цётцы нагадвае позірк беларускай сялянкі, якая схілілася над калыскай немаўляці».



Першы зварот да вобраза Цёткі не стаў апошнім. У 1985 годзе напісала драматычную паэму «Суд Алаізы», што ўвайшла ў яе кнігу «Метраном», за якую атрымала Літаратурную прэмію імя Аркадзя Куляшова. Гэты твор ахоплівае 1902 год, калі Алаіза Сцяпанаўна ў Пецярбургу вучылася на курсах Лесгафта, а таксама 1905-ы. Тады працавала ў псіхіятрычнай бальніцы. Але і вучоба, і праца фарміравалі патрыятычную асобу. У паэме гэтыя моманты не толькі не абыдзены, а і ствараюць асаблівую атмасферу, з якой відаць, як маладое пакаленне жыло ідэаламі будучыні. «Суд Алаізы» — узор грамадзянскай паэзіі.

Аднак Валянціне Коўтун стала «цесна» ў паэзіі. У 1982 годзе ў часопісе «Работніца і сялянка» (сённяшняя «Алеся») яна выступіла са сваім першым апавяданнем «Калінавая гронка залатая», якое праз пяць гадоў дало назву першай кнізе прозы. А ў гэты час узялася за раман пра Цётку «Крыж міласэрнасці», які цалкам выйшаў у 1996 годзе. Адметнасць твора ў тым, што, па словах Валянціны Локун, «знешне па форме (асаблівa кніга першая) раман уз'ядноўвае дзве плыні — аб'ектызаваную аўтарскую і суб'ектывізаваную ад галоўнай гераіні. Аўтарка і яе гераіня нібыта перабіваюць адна адну, дагаворваюць адна адну. Яны адно духоўнае і маральнае цэлае, але не аморфнае, не застылае, а эмацыянальна рухомае і зменлівае. Яны ў напружаным пошуку, у спрэчцы — з сабой, сваім "я", з акаляючым светам, але не для таго, каб гэты свет аддаліць ад сябе, а наадварот, каб яго наблізіць, каб зліцца з ім у адно цэлае, растварыцца ў ім».

Слушна сказала Валянціна Локун: «Заслуга пісьменніцы В. Коўтун у тым, што яна напісала свой адметны раман пра падзеі і жыццё народа ў пачатку XX ст., стварыла сваю Цётку, адлюстраваўшы гэты вобраз па-новаму, не традыцыйна — найперш раскрыла трагічную сутнасць паэтэсы-рэвалюцыянеркі. Гэта быў па тым часе досыць смелы ўчынак з яе боку».

З гэтым творам пазнаёміліся і гледачы. Рэжысёр Дзіямара Ніжнікоўская зняла па сцэнарыі, напісаным Валянцінай Коўтун у суаўтарстве з Фёдарам Коневым, аднайменны гістарычны тэлефільм.

Пайшла Валянціна Міхайлаўна з жыцця 30 красавіка 2011 года.

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**

**Фота з сайта Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры**